Сацыяльная кансультацыя

## Дапамогі і льготы некаторым сем'ям

**На пытанні чытачоў адказваюць спецыялісты Міністэрства працы і сацыяльнай абароны.**

? ***«У мяне нарадзілася другое дзіця. З якога дня я магу разлічваць на дапамогу на старэйшае дзіця: з дня нараджэння малодшага або пасля аплаты бальнічнага ліста па цяжарнасці і родах?»***

— Дапамога на старэйшае дзіця прадугледжана на перыяд выхавання малодшага дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў, але не пазней за дзень спаўнення старэйшаму дзіцяці 18 гадоў. Памер гэтай дапамогі — 50 працэнтаў бюджэту пражытковага мінімуму.

Рашэнне аб яе прызначэнні прымаецца не раней чым у дзень прыняцця рашэння аб прызначэнні дапамогі на дзіця да 3 гадоў. Аднак выплачваецца дапамога на старэйшае дзіця з дня нараджэння малодшага.

? ***«Хто мае права на аплатны дадатковы выхадны ў тыдзень?»***

— Права на адзін дадатковы свабодны ад работы дзень у тыдзень з аплатай у памеры сярэдняга дзённага заробку маюць маці (мачаха) або бацька (айчым), апякун (папячыцель), якія выхоўваюць дзіця-інваліда ва ўзросце да 18 гадоў або траіх і больш дзяцей ва ўзросце да 16 гадоў.

Даецца ён работніку ў тыя тыдні, у якія ён заняты на рабоце 5 або 6 працоўных дзён не менш за 40 гадзін у тыдзень з нармальнай працягласцю працоўнага часу. Асобным работнікам устаноўлена меншая працягласць рабочага часу ў тыдзень.

Для поўных сем'яў умовай для прадстаўлення дадатковага вольнага дня ў тыдзень з'яўляецца занятасць другога з бацькоў (маці (мачахі) або бацькі (айчыма). Да занятасці другога з бацькоў адносяцца: работа (служба), вучоба, ажыццяўленне іншай дзейнасці, перыяд устанаўлення аднаму з бацькоў інваліднасці, а таксама догляд дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў або дзіцяці-інваліда ва ўзросце да 18 гадоў, догляд за інвалідам I групы або асобай, якая дасягнула ўзросту 80 гадоў.

? ***«Майму дзіцяці 5 гадоў, яму ўстаноўлена інваліднасць: 1-я ступень страты здароўя. Ва ўпраўленні сацыяльнай абароны на яго прызначылі пенсію. Ці прадугледжаны на яго яшчэ якія-небудзь выплаты?»***

— Калі ў сям'і выхоўваецца дзіця-інвалід, то, акрамя пенсіі, на дзіця прызначаецца штомесячная дапамога. Называецца яна «дапамога на дзяцей, старэйшых за 3 гады, з асобных катэгорый сем'яў» і прызначаецца па месцы працы, у асобных выпадках — у органах сацыяльнай абароны. Выплачваецца гэта дапамога не толькі на дзіця-інваліда, а на ўсіх дзяцей, старэйшых за 3 гады, якія выхоўваюцца ў сям'і.

Яшчэ адзін від дапамогі, прадугледжаны для такіх сем'яў, — гэта дапамога па доглядзе дзіцяці-інваліда ва ўзросце да 18 гадоў. Яна прызначаецца толькі ў органах па працы, занятасці і сацабароне. Гэта дадатковая дапамога, яна не залежыць ад факта атрымання іншых выплат — пенсіі ці дапамог.

Так, напрыклад, маці, якая знаходзіцца ў водпуску па доглядзе дзіцяці да 3 гадоў, мае права на перыяд такога водпуску атрымліваць на дзіця-інваліда тры віды выплат: **дапамогу** (па месцы работы), **пенсію** і **дапамогу па доглядзе** (у органах па працы, занятасці і сацыяльнай абароне).

З 1 ліпеня 2017 года атрымаць у органах сацыяльнай абароны дадатковую дапамогу па доглядзе дзіцяці-інваліда могуць таксама бацькі, якія працуюць на 0,5 стаўкі або дома, альбо калі яны з'яўляюцца пенсіянерамі.

**Падрыхтавала Святлана БУСЬКО.**

# КУХАР, СТАЛЯР, КАСМАНАЎТ...

## Больш чым у 50 прафесіях паспрабавалі сябе малыя на фестывалі «Букідс»

**Цэнтральны батанічны сад сталіцы на выхадных ператварыўся ў сапраўдную рабочую пляцоўку, дзе малыя маглі атрымаць працоўную кніжку і зарабіць свае першыя грошы. Дзеці гатавалі стравы, саджалі кветкі, запраўлялі аўто і нават даілі карову...**



### Новыя планеты і яблыневы сад

У Цэнтры занятасці арганізатары фестывалю заводзілі дзецям працоўныя кніжкі, з якімі яны адпраўляліся працаўладкоўвацца. За два дні малыя асвоілі мноства навуковых, творчых і рабочых прафесій. За работу па кожнай яны атрымлівалі дзесяць букідсаў — сімвалічную валюту, за якую пасля можна было набыць цацкі ў спецыялізаванай краме.

На свята прыходзілі цэлымі сем'ямі. Мамы і таты ледзьве паспявалі за дзецьмі, якія хацелі паспрабаваць сябе літаральна ва ўсім: ад блогера, эколага і музыканта да байкера, ганчара і археолага.

**Тыя, хто хацеў паспрабаваць сябе ў мужчынскіх прафесіях, працаўладкоўваліся футбалістамі, супрацоўнікамі ДАІ і ратавальнікамі. А творчыя асобы рабіліся музыкантамі, артыстамі цырка і мастацтвазнаўцамі.**

У школе робататэхнікі, напрыклад, малыя працавалі выкладчыкамі IT — праграмавалі і збіралі дынамічныя інтэрактыўныя мадэлі. А ў школе архітэктурнага мыслення «касманаўты» стваралі новыя планеты, называлі іх і запускалі на арбіту паміж дрэў.

«Сантэхнікі» прыкручвалі да падлогі ўнітаз, «плітачнікі» рэзалі плітку і стваралі з яе ўзоры, «маляры» фарбавалі, «будаўнікі» ўзводзілі цагляную сцяну. Юныя «запраўшчыкі» залівалі бензін у аўтамабілі, якімі кіравалі такія ж непаўналетнія кіроўцы.

Тыя, хто хацеў паспрабаваць сябе ў мужчынскіх прафесіях, працаўладкоўваліся футбалістамі, супрацоўнікамі ДАІ і ратавальнікамі. А творчыя асобы рабіліся музыкантамі, артыстамі цырка і мастацтвазнаўцамі.

На фестывалі можна было заняцца і сельскай гаспадаркай. Падаіць карову, стаць пчаляром і выбраць з сотаў мёд. «Агароднікі» высаджвалі яблыневы сад, а «батанікі» праводзілі вопыты з лісцем у навуковай лабараторыі.

### Экаторбы і крэм-суп

Акрамя працаўладкавання, на фестывалі праводзілі майстар-класы, на якія трэба было запісвацца загадзя, бо ахвотных хапала. Дэкаратары, напрыклад, распісвалі фарбамі палатняныя торбы.

— *Майстар-класы ў нас пастаянна новыя. Цяпер дзеці вучацца дэкарыраваць экасумкі, робяць уласныя прынты. Перад гэтым дэкарыравалі брошкі, значкі і магніты,* — кажа **Лізавета, спецыяліст Сямейнага цэнтра Кацярыны КАЎРОВАЙ.** — *Крыху пазней яны будуць дэкарыраваць кашпо для кветак і вучыцца змешваць колеры.*

У гэты час «інкасатары» правяралі грошы на сапраўднасць, разглядаючы на камп'ютары вадзяныя знакі. «Банкіры» рабілі скарбонкі і кашалькі.

— *Вучымся не толькі браць растэрміноўкі і крэдыты, але і зберагаць грошы,* — жартуе **вядучы майстар-класа Раман СІНЯТКІН, выкладчык фінансавай асветы.**

«Кухары» гатавалі крэм-суп з морквы, імбіру і вяршкоў. Страву гэтую нават не трэба было варыць.

— *Пакуль садавіна ўзбіваецца ў блэндары, які робіць 30 тысяч абаротаў за хвіліну, яна награваецца да 80 градусаў — у выніку гатовы гарачы суп,* — кажа **Наталля ЛАПО, кіраўнік дзіцячых майстар-класаў.**

«*Дзеці тут усё з'ядаюць да дна, а дома яшчэ паспрабуй у іх той суп з агародніны запіхнуць*», — смяецца мама «кухара» Вікторыі, якая толькі што наразала моркву, а пасля адным махам праглынула паўкубачка супа-пюрэ.

### Горад з макароны і лаўка з кветак

Бацькі з задавальненнем працавалі разам з дзецьмі. Таты выпільвалі разам з юнымі «сталярамі» драўляныя шаблі, гаечныя ключы і малаткі. Дапамагалі маленькім «архітэктарам» узводзіць дамы з труб і кардону. Былі тут і будынкі з макароны ды згорнутых у трубачкі газет. З усіх гэтых канструкцый у батанічным садзе вырас цэлы горад будучыні. Заняткі тут, дарэчы, праводзілі сапраўдныя будучыя архітэктары, студэнты БНТУ па спецыяльнасці «архітэктура».



Узрост для работы не меў ніякага значэння. Вось, напрыклад, дом-робат з кардонак рабіў на будаўнічай пляцоўцы Кірыл, а дапамагала яму мама Настасся з немаўляткам на руках. Кажа, што зусім не цяжка спраўляцца з дзеткамі на такім мерапрыемстве, нават весела! Іншыя мамы краілі і рэзалі разам з дочкамі-«швачкамі», пільна сачылі, як модніцы-«візажысты» асвойваюць мастацтва макіяжа, і малявалі з маленькімі «мастачкамі» карціны, з якіх паміж дрэў стварылі цэлую арт-галерэю.

Супрацоўнікі батанічнага сада з маленькімі «ландшафтнымі дызайнерамі» стварылі інтэрактыўны арт-аб'ект — лаўку, упрыгожаную кветкамі.

— *Мы падабралі расліны і разам з дзеткамі ўпрыгожваем кампазіцыю, якая застанецца тут, пакуль не скончыцца сезон,* — паабяцала **Алена ПУЗАНКЕВІЧ, кіраўнік сектара ландшафту, архітэктуры і фітадызайну Цэнтральнага батанічнага саду.**

### Сапраўдныя грошы і абдымкі

Для работы ў розных прафесіях арганізатары фестывалю давалі ўсе неабходныя матэрыялы. Аднак былі тут і тыя, хто зарабляў самыя сапраўдныя грошы, гандлюючы таварамі, створанымі ўласнымі рукамі. Юныя прадаўцы дзелавіта заклікалі пакупнікоў, нахвальваючы свой тавар.

— *Мы самі гатавалі ўсё. Бабуля дала нам рэцэпт і сачыла, каб мы нічога не наблыталі,* — кажа 11-гадовая Варвара, якая разам з 9-гадовым братам Міцем гандлявала тварожным і шакаладным печывам і маліновым зефірам.

За няпоўны дзень дзеці зарабілі каля 60 рублёў.

— *Мы за тое, каб бацькі і дзеці бавілі час разам. Дома ва ўсіх свае справы, нават пасядзець у абдымку з малымі часу няма, а тут такія магчымасці ёсць!* — гаворыць **арганізатар фестывалю «Букідс» Таццяна ЮЗЭФОВІЧ.** — *Мы стараемся заўжды разнастаіць праграму і, акрамя творчых і тэатральных пастановак, робім тэматычныя пляцоўкі. Цяпер гэта прафесіі, дагэтуль былі кнігі, адукацыя і спорт, а таксама ўзаемадзеянне дзіцяці з навакольным асяроддзем.*

Падчас мерапрыемстваў знясіленыя дарослыя падалі ў крэслы-мяхі і проста на траву, а нястомныя гледачы працягвалі скакаць ды весяліцца. Самыя маленькія забаўляліся ў пясочніцы з гароху ды расфарбоўвалі малюнкі. Падсілкавацца ж усе ахвотныя маглі стравамі на фермерскім фудкорце, дзе, акрамя іншага, прапаноўвалі экзатычныя напоі, накшталт ліманаду з агурка, лімона і базіліка. Так што забаўкі, ежа ды праца на фестывалі былі больш чым крэатыўныя і пакідалі моцныя ўражанні.

**Ірына СІДАРОК, фота аўтара.**